УДК 930"1815/1850"

Л. Я. Клімуць

# ЗАРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ НАПІСАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ Ў ЭПОХУ РАМАНТЫЗМУ[2]

Написание национальной истории возникло как реакция на идеи Просвещения и Французской революции. Ее создателями чаще всего были не профессиональные историки, движимые желанием определить место и роль своего народа в истории. Эти истории выдвигали идею уникальности национальной идентичности. Эти авторы создали основополагающие национальные мифы, на которых базируется национальный нарратив. Национальные истории этого периода ориентированы на национальное государство или конкретную этническую группу.

***Ключевые слова:*** национальная история, романтизм, национальное государство, национальная культура.

Ужо ў другой палове XIX ст. аўтары знаходзілі сувязь паміж складваннем нацыянальнай ідэі і развіццём гістарычнай навукі ў Германіі ў першай палове XIX ст. На працягу стагоддзя гістарычная навука распаўсюдзілася па Еўропе. Такім чынам, гісторыя ў азначаны ў дакладзе перыяд не лічылася яшчэ прафесійнай навукай, але стала надзвычай папулярнай, таму што мела здольнасць мабілізаваць народ, надаючы яму ідэнтычнасць і арыентацыю. У першай палове XIX ст. з'яўленне нацыянальнай традыцыі напісання гісторыі было звязана з інтэлектуальнай плынню, якая артымала назву «рамантызм».

Рамантызм успрымаецца перш за ўсё як літаратурны, філасофскі і мастацкі рух, накіраваны супраць рацыяналізму Асветніцтва. З пункту гледжанная філасофіі галоўны ўплыў на яго прадстаўнікоў зрабілі Жан-Жак Русо і Ёган Готфрыд Гердэр. У палітычным сэнсе гэта быў разнастайны рух, у яго ўваходзілі прадстаўнікі розных палітычных поглядаў.

Рамантызм таксама быў рэакцыяй на ўніверсалісцкія памкненні Французскай рэвалюцыі і Напалеона. У супрацьвагу ўніверсалізму рамантыкі прасоўвалі ідэю спецыфічнасці і ўнікальнасці нацыянальнай ідэнтычнасці. Еўрапейская гісторыя стала гісторыяй своеасаблівых нацыянальных шляхоў. Гэта ідэя не страціла сваёй сілы пры напісанні гісторыіі асобных краін і сёння. Поруч з гэтым сцвярджаюцца і ідэі перавагі адных нацый над другімі, а гэта цягне за сабой тэрытарыяльную экспансію і дыскрымінацыю супраць тых, каго лічаць знешнімі і ўнутранымі ворагамі.

У першай палове XIX ст. напісанне гісторыі і нацыянальныя ідэі існавалі ў сімбіятычных адносінах. Суадносна ўзнікае пытанне, якія базавыя элементы ляглі ў аснову канструкцыі нацыянальных гісторый у Еўропе і якія інстытуты спрыялі сцвярджэнню ідэі нацыяналізму ў гістарычных працах. Гэта дапаможа нам зразумець, як развіваліся адносіны паміж напісаннем гісторыі і канструкцыяй нацыянальнай ідэнтычнасці.

Асветніцтва вызваліла гісторыю ад уплыву тэалогіі і адкрыла шлях для напісання свецкай гісторыі на не рэлігійныя тэмы. Гісторыкі Асветніцтва цікавіліся нацыянальнай

[2] Результаты исследования получены при выполнении задания 12.1.2 ГПНИ «Общество и гуманитарная безопасность белорусского государства», подпрограмма: «Формирование белорусской государственности и социума в контексте цивилизационного развития в Европе и мире: историко-антропологический анализ».



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

гісторыяй, але яны шукалі ў ёй універсальныя нормы і каштоўнасці. Гісторыкі Асветніцтва імкнуліся растлумачыць развіццё чалавецтва і стварылі т. зв. «вялікія гістарычныя наратывы».

Адным з першых цэнтраў напсіання гісторыі ў перыяд Асветніцтва ў Еўропе быў Гётынгенскі ўніверсітэт, дзе гісторыя стала прафесійнай навукай. Прафесійную этыку ў гістарычнай навуцы прасоўваў Леапольд фон Ранке, прафесар гісторыі ў Берлінскім універсітэце. Ён разважаў над метадалогіяй і асноўнымі правіламі напісання гісторыі і лічыцца заснавальнікам гістарызму, ці, як яго яшчэ называюць, гістарыцызму.

Ранке моцна паўплываў на еўрапейскую гістарыяграфію. Ранке пісаў нацыянальныя гісторыі для таго, каб вызначыць спецыфічныя рысы нацыянальных тыпаў. Для Ранке гістарычны аналіз на нацыянальным узроўні ствараў сувязь паміж гістарычным аналізам дзейнасці гістарычных асоб і аналізам сусветнай гісторыі. Такім чынам, ён насіў прамежкавы характар. Нямецкі філосаф Гердэр быў прасякнуты асветніцкай думкай і спачатку вітаў Французскую рэвалюцыю. Аднак ён не ўспрымаў універсалізм і шукаў аўтэнтычнасць нацыянальных культур, у выніку чаго зараджаюцца фальклорныя даследаванні, зборы народных казак і даследаванне народнай культуры па ўсёй Еўропе. Гердэр шукаў індывідуальнасць у кожнай нацыі і культуры, і ён аддаваў перавагу тэрміну «народ». Нацыянальны характар, ці народны дух, не змяняецца і праяўляецца праз нацыянальную гісторыю. Такім чынам, галоўнай адзінкай сусветнай гісторыі з'яўляецца нацыя. Галоўную ролю ў развіцці народнага духу адыгрывае нацыянальная мова, і Гердэр вызначае нацыянальнасць пераважна ў культурных тэрмінах. З гэтага вынікае, што ён асуджаў нацыянальную пыху і адчуванне нацыянальнай перавагі [1]. Пасля Гердэра сотні нацыянальных гісторыкаў па ўсёй Еўропе імкнуліся знайсці гістарычныя карані сваёй нацыі і рэканструяваць свой народны дух. Некаторыя ж, напрыклад венгры, імкнуліся абвергнуць Гердэра, які прадказваў, што венгерская мова знікне сярод славян, немцаў і іншых народаў [2].

Безумоўна, уплыў Гердэра на развіццё гістарызму быў вялізным, але нельга не адзначыць і сувязь гістарызму з тэалогіяй у XiX ст. і ў Ранке гэта выявілася ў яго ўяўленнях аб тым, што нацыі – гэта думкі Бога. Гэта паказвае нам, наколькі тэалогія ўплывала на напісанне гісторыі.

У пратэстанцкай Еўропе бацькамі многіх вядомых гісторыкаў былі пастары. Гэты факт уздымае пытанне сацыяльнага паходжання гісторыкаў першай паловы XiX ст. У Заходняй і Цэнтральнай Еўропе з'яўляюцца інтэлектуалы, якія могуць жыць, хай і небагата, са сваіх прац. Так, у Венгрыі і Польшчы сярод гсіторыкаў мы бачым арыстакратаў, які мелі сродкі да існавання. У Сербіі першыя гісторыкі часта былі правадырамі этнічных плямёнаў. А вось рамеснікаў і сялян цяжка знайсці сярод першых нацыянальных гісторыкаў. У той жа час трэба адзначыць, што да 1850 г. нейкага адзінства сацыяльнага паходжання сярод еўрапейскіх нацыянальных гісторыкаў не было.

Таксама нацыянальная гісторыя першай паловы XiX ст. была цесна звязана з літаратурай. Яна была прызначана не для спецыялістаў, а для адукаванай публікі ўвогуле. Гістарычныя раманы В. Скота натхнялі пакаленні нацыянальных гісторыкаў. А. Цьеры назваў яго найвялікшым гістарычным празорцам [3, с. 95]. Пошукі аўтэнтычных літаратурных канонаў і кадыфікацыя літаратурнай мовы былі часткай нацыянальнай гістарыяграфіі. Гісторыю ўсё яшчэ ўспрымалі як мастацкую форму, але цяпер гісторыя займала месца дзесьці пасярэдзіне паміж мастацтвам і навукай.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

і, напрыклад, Ранке быў цвёрда ўпэўнены, што пярвейшая задача гісторыка – знайсці эстетычныя формы для свайго аповяду, такія, якія спадабаюцца чытачу.

Вялікі ўплыў на гістарычную думку мела Французская рэвалюцыя 1789 г. і распаўсюджванне яе каштоўнасцяў Напалеонам. Французская рэвалюцыя стала яркай праявай зараджэння сучаснага нацыяналізму: яна прывязвала ўсё насельніцтва канкрэтный нацыянальнай тэрыторыі да ідэй свабоды, роўнасці і братэрства. Французскія рэвалюцыянеры і Напалеон, а таксам іх праціўнікі падзялялі ідэю аб тым, што яны жывуць у эпоху фундаментальных гсітарычных змен. Адсюль зразумела, чаму інтэлетуальную атмасферу першай паловы ХіХ ст. характарызаваў фундаментальны крызіс. Гістарызм стаў адным з адказаў на гэты крызіс: ён прапаноўваў мадэль арганічнага гістарычнага развіцця і аўтэнтычнага нацыянальнага характару.

У нямецкіх землях у першай палове ХіХ ст. назіраўся сапраўдны бум нацыянальнай гісторыі. Гэтыя працы сцвярджалі, што нацыя развіваецца па сваёй уласнай логіцы. Разуменне кожнай нацыянальнай культуры як асобнага космасу прынамсі часткова тлумачыць канцэнтрацыю гісторыкаў на нацыянальнай гісторыі. Канцэпцыю ўніверсальнай цывілізацыі ўсё больш замяняе канцэпцыя нацыянальнай культуры. Гэты працэс можна назваць нацыяналізацыяй гістарыяграфіі.

У рамантызме гісторык ідэалізуецца як святар і пакутнік на службе гісторыі: ён аднаўляе мінулае і садзейнічае прафесіяналізацыі гістарычнай навукі, у якой гісторыкі становяцца адзінымі інтэрпрэтатарамі нацыянальнага мінулага [4]. Лічылася, што іх метадалогія, асабліва крытыка крыніц і філалагічна-крытычны метад, давалі гісторыкам магчымасць разабрацца ў мінулым. Б. Г. Нібур, прафесар антычнай гісторыі ў Берлінскім універсітэце, перапісаў гісторыю Рыму пасля крытычнага перагляду тэкставых і матэрыяльных крыніц. Ён стварыў стандарт таго, як выкарыстоўваць філалогію для вывучэння гісторыі. Германеўтычна-філалагічны метад дазваляў гісторыкам прэтэндаваць на аб'ектыўнасць, і сваю гістарычную праўду яны выкладалі ў мана-графіях. Гэтыя гісторыкі-навукоўцы хвалілся тым, што паспяхова развенчвалі гістарычныя міфы, але яны выкарыстоўвалі гэту метадалогію і для легітымацыі сваёй уласнай нацыі. Адсюль і невырашальная праблема: гісторыя пагражае нацыянальнай міфалогіі, але ў той жа час стварае нацыянальную ідэнтычнасць.

Хоць крытычна-філалагічны метад працаваў супраць рамантызацыі мінулага і развянчаў многія міфы, назіраецца супадзенне мэтаў. Гістарычныя веды павінны былі даць практычны напрамак сучасным дзеянням. Без разумення мінулага нельга стварыць будучыню. Цесная сувязь гісторыі і ідэнтычнасці праявілася ў веры ў тое, што немагчыма адказаць на пытанне, хто ты ёсць і куды ідзеш, калі ты не ведаеш, кім ты быў раней (так бы мовіць, адкуль ты прыйшоў).

Нацыянальныя гісторыкі рамантызму абапіраліся на Гердэра і Ё. Г. Фіхтэ, які надаў нацыі сакральны сэнс. Для Фіхтэ гэта маральны калектыў, які злучае пакаленні. Але ў яго ж зарадзілася і праблематычная ідэя іерархіі нацый. Для Фіхтэ гісторыя была аплотам і абаронай ад Французскай рэвалюцыі, ад універсалізму. Ф. Шлегель акцэнтаваў пераемнасць гістарычнай эвалюцыі, калі ў 1811 г. падсумаваў галоўныя рысы рамантычнага напісання гісторыі. Хрысціянская Еўропа складалася з нацыянальных індывідуальнасцяў. Галоўныя тэрміны нацыянальнай гісторыі рамантызму – «развіццё» і «эвалюцыя», яна падкрэслівае захаванне нацыянальных рысаў і нязменнасць народу. Традыцыя, прадстаўленая гісторыяй, супрацьпастаўлялася ідэям дзяржаўнасці, сфармуляваным французскімі рэвалюцыянерамі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Такі погляд на гісторыю падтрымоўвалі і філосафы, не звязаныя з рамантызмам. У Гегеля сусветны дух развіваўся праз розныя гістарычныя стадыі да дасканаласці. У сваёй ідэі развіцця больш рацыянальнай палітычнай арганізацыі на працягу гісторыі ён бліжэй да Асветніцтва. Але ад яго нямецкія гісторыкі ўзялі ідэю дзяржавы як этычнай мэты. У Швецыі таксама шведскія гісторыкі не ўяўлялі сабе шведскай нацыі без дзяржавы, а дзяржаўную ўладу ўвасабляў кароль.

Такім чынам, напісанне нацыянальнай гісторыі ў Еўропе пачало развівацца вельмі хутка. Першая палова XIX ст. стала перыядам узнікнення нацыянальнага гістарычнага наратыву.

Нацыянальныя гісторыі, напісаныя ў гэты перыяд, маюць агульныя рысы. Гэта не толькі імкненне вызначыць нацыянальную тэрыторыю, але і стварыць канон нацыянальных герояў і ворагаў. Да найбольш важных праблем належала вызначэнне тэрыторыі нацыі, бо гісторыкі рамантызму лічылі, што канкрэтныя рысы народа з'яўляюцца адбіткам навакольнай прыроды. Так, у нямецкіх нацыянальных гісторыях лясы з'ўляюцца адзнакай нямецкага характару.

Для вялікіх нацый ідэя нацыянальнай тэрыторыі ўключала ў сябе ідэю нацыі, якая складаецца з розных рэгіёнаў. Для гісторыкаў было важным не супрацьпастаўляць рэгіёны як канкурэнтаў з нацыяй, але паказваць, што нацыя ўтрымлівае ў сабе розныя, але аб'яднаныя разам рэгіёны. Прусіі, напрыклад, было прадвызначана аб'яднаць Германію, а сярэднявечныя абшчыны Фландрыі паказваліся як калыска бельгійскай нацыянальнай дзяржавы. Былі нацыі, місіяй якіх было абараняць Еўропу ад агрэсіі не еўрапейцаў: Іспанія, Польшча, Венгрыя, Расія.

Для нацый, якія мелі дзяржаўнасць, тэрыторыя нацыі супадала з тэрыторыяй гэтай дзяржавы, і ў гістарычных наратывах відавочна арыентацыя на дзяржаву з увагай да яе ўнутранай і знешняй палітыкі. Паколькі гісторыя атаясамлівалася менавіта з палітычнай гісторыяй, ці гісторыяй дзяржаў, дзяржавы падтрымоўвалі нацыянальныя наратывы і нацыянальную гісторыю. Вынікам было тое, што ў цэнтры нацыянальнай гісторыі стаяла дзяржава. Адсюль такая важнасць ваеннай, дынастычнай і канстытуцыйнай гісторыі ў многіх нацыянальных гісторыях.

Прыкладам нацыянальнай гісторыі як гісторыі дзяржавы з'яўляецца англійская вігская традыцыя Т. Б. Маколея і яго пераемнікаў. У Маколея рэвалюцыя 1688 г. прынесла прымірэнне, а не падзел, а яе калектыўным героем была нацыя, якая сабралася для абароны свабоды і праўлення закона. Пераемнікі Маколея пісалі англійскую гісторыю як прагрэсіўнае развіццё грамадзянскай і рэлігійнай свабоды і парламенцкай канстытуцыі. XVII стагоддзе было самым важным перыядам для замацавання гэтых свабод.

Бітвы, войны, грамадзянскія канфлікты асабліва цікавілі нацыянальных гісторыкаў. Бітвы пры Моргартэне і Земпаху ў 1315 і 1386 гг. адпаведна былі асноватворнымі момантамі нацыянальнай гісторыі Швейцарыі. Перамога над Ордэнам пры Грунвальдзе ў 1410 г. і каля Чанстаховы ў 1665 г. вызначалі польскі нацыянальны дух. Параза сербаў у 1389 г. і венграў у 1526 г. ад туркаў прадстаўляліся як надзвычай важныя моманты нацыянальнай гісторыі. Такую ж ролю адыгрывала бітва пры Куртрэ 1302 г. для фламандскай нацыянальнай ідэнтычнасці. Супраціўленне, у тым ліку ваеннае, замежным прыгнятальнікам было ключавым момантам нацыянальнай гісторыі Грэцыі і Ірландыі.

Аднак многія нацыянальныя гісторыі не маглі устанавіць сувязь паміж тэрытарыяльнымі прэтэнзіямі нацыі і сучаснай або мінулай дзяржаўнасцю. Тады больш



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

увагі надаецца культуры народа і яго гісторыі, а не гісторыі дзяржавы. Напрыклад, стварэнне Фінскага літаратурнага таварыства ў 1831 г. і публікацыя «Калевалы» у 1835 г. далі фінскай нацыі нацыянальны наратыў у выглядзе паэзіі і народнай культуры. Але этнакультурнае вызначэнне нацыі часта сутыкаецца з праблемай этнакультурнага дуалізму. Так, у Багеміі праблемай было вызначыць гісторыі чэхаў і немцаў.

Этнізацыя нацыянальнай гісторыі прыводзіла да вызначэння этнічнасці як культуры. Аднак у этнічных нацыянальных гісторыях ужо прысутнічалі і расавыя моманты. Такую мадэль інтэпрэтацыі для Бельгіі выкарыстоўваў Кервін дэ Летэнховэ, у якога гісторыя Фландрыі будуецца вакол барацьбы паміж фламандцамі саксонскай крыві і паўднёвай Бельгіяй з франкскімі каранямі.

Таксама нацыянальныя гісторыі можна падзяліць на тыя, якія падтрымоўвалі існуючы палітычны парадак, і тыя, якія аспрэчвалі гэты парадак. У Расіі пасля 1803 г. і ў Прусіі пасля 1841 г. прызначалі афіцыйных гісторыкаў, якія павінны былі ідэалізаваць існуючую дзяржаву і кіруючую дынастыю. і адваротны прыклад: Ф. Палацкі быў прызначаны сеймам у 1831 г. «гістарыёграфам Багеміі» з мэтай сцвярджэння чэшскай ідэнтычнасці ў супрацьвагу анямечванню.

Важнай праблемай для нацыянальных гісторыкаў была і перыядызацыя, таму што ім хацелася прасачыць паходжанне сваёй нацыі як мага далей у глыбіню вякоў. Праблема з пошукамі пачатку нацыянальнай гісторыі заключаецца ў супярэчнасці паміж прэтэнзіямі гісторыкаў на аб'ектыўнасць і цяжкасцямі ў выкарыстоўванні іх метадалогіі для ўстанаўлення гістарычнай праўды. Старажытныя продкі нацыі звычайна былі мужнымі воінамі, а ў працах ліберальных гісторыкаў перыяду гучаць і дэмакратычныя ноткі. Можна ўспомніць готаў у іспаніі і Швецыі, розныя германскія плямёны ў Германіі, батаваў у Галандыі, англасаксаў у Англіі, галаў у Францыі і мноства іншых. і мы бачым, што ў нацыянальных гісторыях Еўропы пачатку XiX ст. важнае месца займаюць племянныя міфы продкаў, хоць пра іх вядома было не так і многа.

Выкарыстоўваюць нацыянальныя гісторыі і канцэпцыю «доўгай працягласці», таму што праблема пачатку нацыі была цяжкавырашальнай. Гісторыкі звярталіся да Сярэднявечча ў тым ліку і таму, што былі даступныя крыніцы. Па ўсёй Еўропе друкавалі выданні сярэднявечных тэкстаў, якія павінны былі падмацаваць ідэю велічы нацыі. Апеляцыя да Сярэднявечча – адна з самых характэрных рысаў напсіання гісторыі ў перыяд рамантызму, асабліва гэта тычылася тых нацый, у якіх было т. зв. «вялікае Сярэднявечча».

Нацыянальныя гісторыкі таксама выкарыстоўвалі перыядызацыю, якая паказвала нацыянальную гісторыю ў выглядзе перыядаў развіцця і заняпаду. Гэтую мадэль заснаваў Э. Гібан у «Гісторыі заняпаду і разбурэння Рымскай імперыі» (1776–1788). Але нават пасля знікнення незалежнай нацыянальнай дзяржавы яна ўваскрэсне, і наступіць новы «залаты век». У такіх гісторыях больш дэтальна расказвалася пра некалькі гадоў ці нават тыдняў, якія лічыліся важнымі момантамі гісторыі, у той жа час цэлыя стагоддзі маглі ўкладваць у некалькі сказаў.

Многія нацыянальныя гісторыі праслаўляі ідэю свабоды і крытыкавалі дэспатызм і разбэшчанасць арыстакратычнай эліты. Таксама яны абрушваліся на царкву, што было ў традыцыі Асветніцтва. З другога боку, было мноства рэлігійных наратываў у еўрапейскай нацыянальнай гісторыі. У поліканфесійных нацый з'яўляюцца канфесійныя нацыянальныя гісторыі, якія расказваюць гісторыю нацыі з пункту погляду сваёй канфесіі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Нацыянальная гісторыя толькі нараджалася ў першай палове XIX ст., таму ёй трэба было вызначыць сваю пазіцыю адносна рэлігіі і царквы, наратывы якой былі ўжо даволі распрацаванымі ў гісторыі. Таксама гісторыкі, напрыклад Ж. Мішле, пачынаюць звяртаць увагу на класавыя праблемы і сацыяльныя пытанні. Тыя, хто цікавіўся гісторыяй трэцяга саслоўя, пісалі пра яго ролю ў сучаснай ці будучай нацыянальнай дзяржаве.

Гендэрны аспект таксама прысутнічаў у нацыянальных гісторыях. Працэс прафесіяналізацыі гісторыі суправаджаўся працэсам маргіналізацыі жанчын, і гісторыкі сёння сутыкаюцца з цяжкасцямі ў вызначэнні ролі жанычын у стварэнні гістарычных ведаў. У гістарычных наратывах нацыянальнай гісторыі захоўваўся традыцыйны падзел сфер на мужчынскую і жаночую і праводзілася ідэя аб тым, што нацыя шчасліва развіваецца, калі кожны выконвае сваю прызначаную ролю. Паколькі публічную, актыўную ролю ў грамадстве павінны былі выконваць мужчыны, адбывалася маргіналізацыя жанчын І як тэмы даследаванняў, І як аўтараў гістарычных твораў.

У сувязі з дадзенай тэмай неабходна зразумець, чаму нацыянальная гісторыя з'явілася менавіта ў першай палове XIX ст. Гісторыя яшчэ не была па-сапраўднаму самастойнай дысцыплінай ва ўніверсітэтах.

Мадэлямі для тых, хто цікавіўся выданнем гістарычных крыніц, былі антыквары XVI–XVII стст. Важную ролю ў развіцці нацыянальнай гісторыі адыгралі гістарычныя таварыствы, якія, як правіла, складаліся з аматараў.

Звычайна гэта былі невялікія таварыствы. Як правіла, яны прысвячалі сваю дзейнасць гісторыі свайго рэгіёна ці правінцыі. Гістарычнае таварыства ў Швейцарыі існавала толькі с 1811 па 1833 г. Маскоўскае таварыства гісторыі і рускай старажытнасці выконвала прафесійныя і сацыяльныя функцыі, яно было самым важным сродкам камунікацыі паміж рускімі гісторыкамі ў пачатку XIX ст. У манархіі Габсбургаў – шматнацыянальнай імперыі – рыторыка такіх таварыстваў не зусім супадала з мэтамі. Перад гісторыкамі ставілася задача нацыянальнай адукацыі, але яна атаясамлівалася з лаяльнасцю дынастыі.

Важнай праявай гістарычнай дзейнасці ў Еўропе быў збор І публікацыя крыніц. Мадэль ізноў стварыла Германія. *Monumenta Germaniae Historica* ставіла перад сабой патрыятычныя мэты.

Цікавасць да напісання нацыянальнай гісторыі суправаджался крызісам характэрнай для Асветніцтва цікаўнасці да не еўрапейскіх народаў. Тым не менш не ўсе пісалі толькі нацыянальную гісторыю. Так, Ф. Шлёсэр захоўваў цікавасць да ўсеагульнай і культурнай гісторыі. А праграмы нямецкіх універсітэтаў, з аднаго боку, уключалі рэгіянальную гісторыю, а з другога, еўрапеўскую і сусветную.

Трэба ўлічваць, што большая частка Еўропы была ўсё ж арганізаваная ў імперыі, і нацыянальнай гісторыі не проста было зацвердзіцца, таму што ў імперыях не было вялікай цікавасці да нацыянальных наратываў. Так, калі ў Ірландыі былі заснаваны новыя ўніверсітэты ў 1849 г., у іх не было асобных кафедр гсіторыі. Гісторыя была занадта спрэчным прадметам з рэлігійнага і палітычнага пункту погляду.

Лакальная І рэгіянальная гісторыя таксам займала сваё месца ў першай палове XIX ст. Рэгіяналізм увогуле быў характэрны для Еўропы перыяду рамантызму. У вялікіх гарадах, не сталіцах (Барселона, Гамбург), пісалі мясцовую гісторыю, свядома адмяжоўваючыся ад нацыянальных наратываў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Такім чынам, на напісанне нацыянальнай гісторыі паўплывала развіццё гістарызму ў нямецкіх землях. У вялікай ступені гэта была рэакцыя на ўніверсалізм Асветніцтва і Французскай рэвалюцыі. Для нацыянальнай гісторыі было важным вызначэнне тэрыторыі нацыі і межаў гэтай тэрыторыі. Нацыянальны наратыў мог арыентавацца на дзяржаву ці на этнічную гістрыю без прывязкі да дзяржавы. Звычайна Сярэднявечча разглядалася як ключавы перыяд пачатку фарміравання адметнай нацыі. Нацыянальная гісторыя стварала канон нацыянальных герояў і нацыянальных ворагаў.

Аднак нацыянальныя наратывы не ўкладваюцца ў вузкія рамкі. існуе моцная сувязь паміж лібералізмам і напісаннем нацыянальнай гісторыі, і гісторыя станавілася аргументам стварэння ліберальнага палітычнага парадку. Але ў нацыянальнай гісторыі быў і свой цёмны бок. З нацыянальных гісторый выраслі і расавыя ідэі, і ідэі маргіналізацыі асобных груп. Таму нацыянальныя гісторыі паспрыялі таксама нецярпімасці, дыскрымінацыі, этнічным чысткам, генацыду і войнам.

Гістарычны нацыяналізм фарміраваўся ў канкрэтных інстытутах. Аўтарамі галоўных нацыянальных наратываў былі дзяржаўныя служачыя, духавенства, арыстакраты, сярэдні клас, але не ўніверсітэты. Таму гэта былі гісторыкі-аматары, але яны дзейнічалі праз асацыяцыі, музеі і часопісы.

Такім чынам, менавіта першая палова XIX ст. стала часам нараджэння нацыянальнай гісторыі.

*Спіс літаратуры*

1. Nisbet, H. B. Herder: The Nation in History / H. B. Nisbet // National History and Identity: Approaches to the Writing of National History in the North-East Baitic Region, Nineteenth and Twentieth Centuries / Michael Branch (ed.). – Tampere, 1999. – P. 78–96.

2. Johann, G. H. idées sur ia philosophie de l'histoire de l'humanité [Electronic resource] / G. H. Johann. – Paris, 1827. – Voi. 2, part 4, book 6, ch. 2. – Mode of acces: https://babel.hathitrust.org/cgi/pt?id=hvd.hxjf2k&view=1up&seq=9. – Date of access: 03.04.2023.

3. Gossman, L. Between History and Literature / L. Gossman. – L. : Harvard University Press, 1990. – 416 p.

4. Toiiebeek, J. Seeing the Past with the Mind's Eye: The Consecration of the Romantic Historian [Electronic resource] / J. Toiiebeek // Cilo. – 2020. – № 29:2. – P. 167–191. – Mode of access: https://go.gaie.com/ps/i.do?id=GALE%7CA62981232&sid=googieSchoiar&v=2.1&it=r&linkaccess=abs&issn=08842043&p=AONE&sw=w&userGroupName=mlin_oweb&isGeoAuthType=true. – Date of access: 04.04.2023.

**Климуть Лада Ярославовна**, Могилёвский государственный университет имени А. А. Кулешова; kaleld30@yahoo.com.

**THE ORIGIN OF THE TRADITION OF WRITING NATIONAL HISTORY DURING THE ROMANTIC PERIOD**

The writing of national history emerged as a reaction to the ideas of the Enilghtenment and the French Revoiution. Most often, its creators were not professional historians, driven by the desire to determine the place and role of their natlons in history. These stories promoted the idea of a unique national identity. These authors created foundationai nationai myths upon which nationai narratlves would draw. The national histories of this period were focused on the nation state or a specific ethnic group.

***Keywords:*** national history, Romanticism, nation-state, national cuiture.

**Lada Klimout**, Mogilev State A. Kuleshov University; kaleid30@yahoo.com.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова